# Да 75-годдзя з дня нараджэння Ф. Э. Дзержынскага

На прадпрыемствах, ва ўстановах, у калгасах праводзяцца лекцыі і гутаркі аб жыцці і дзейнасці мужнага сына нашай партыі Ф. Э. Дзержынскага.

У дапамогу лектарам рэспубліканскае таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў выдала і разаслала па сваіх абласных аддзяленнях брашуру І. М. Разанава «Ф. Э. Дзержынскі — выдатны дзеяч большэвіцкай партыі і савецкай улады».

З цікавасцю разглядаюць наведвальнікі чытальнай залы Дзяржаўнай бібліятэкі імя В. І. Леніна добра аформленую выстаўку літаратуры аб Ф. Э. Дзержынскім. Тут — выказванні Леніна і Сталіна аб Феліксу Эдмундавічу, перапіска Ф. Э. Дзержынскага з В. І. Леніным, мастацкая літаратура, прысвечаная «жалезнаму Феліксу».

Вялікая кніжная і фотавыстаўка «75 год з дня нараджэння Ф. Э. Дзержынскага» аформлена ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна.